# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

***№ 2 (67) КАСТРЫЧНІК 2020***

**Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно”**

**УСЕ ЗОРКІ НА ШКОЛЬНЫМ НЕБАСХІЛЕ**

*Матэрыял аб правядзенні канцэрта да Дня настаўніка чытайце на ст. 2-3*





**ВІНШУЕМ ПАЛЯГОШКА ВЕРАНІКУ І РУСАКОВУ ПАЛІНУ,**
**якія сталі ўладальнікамі ДЫПЛОМА II СТУПЕНІ навукова-практычнай канферэнцыі Мінскай вобласці**

*Матэрыял пра ўдзел у конкурсе чытайце на ст. 5*





**НА ПРАЦОЎНАЙ НІВЕ**

*Матэрыял пра маладых спецыялістаў чытайце на ст. 7*

# 2

# УСЕ ЗОРКІ НА ШКОЛЬНЫМ НЕБАСХІЛЕ

**У сілу сваёй прафесіі настаўнік адначасова з'яўляецца і сцэнарыстам, і рэжысёрам сваіх урокаў, і акцёрам-выканаўцам рознапланавых роляў ад Атэла і да Каперніка! А калі казаць пра нашу школу, то з даўніх часоў яна служыла пляцоўкай для разнастайных творчых эксперыментаў, кузняй талентаў, дзе кожны настаўнік - супермегазорка!**

Менавіта таму канцэртная праграма да Дня настаўніка прайшла ў форме кінафэстываля **«Усе зоркі»**. Права адкрыць фэст было прадстаўлена дырэктару ўстановы Святлане Віктараўне Абрамовіч.



Дзякуючы вядучым мерапрыемства К.Бубенька, З.Шпакоўскаму, І.Жаўнерчыку, Л.Маркоўскай мерапрыемства прайшло на вясёлай ноце. Настаўнікам у розных намінацыях былі ўручаны сімвалічныя ўзнагароды.







У якасці падарунка для настаўнікаў выканалі танец калектыў старшакласніц, а таксама сола выступіла перад прысутнымі вучаніца 5 класа Шніткова Яўгенія.

У забаўляльна-гумарыстычнай форме вучні старшых класаў і Максім Плаксін і Дзмітрый Жаўряновіч у ролі даследчыкаў-біёлагаў выступілі з дакладам пра такія школьныя “біявіды”, як настаўнік, бацькі, вучні.







Вучаніцы 5 “А” класа выканалі прыпеўкі на тэму школьнага жыцця. “У доски интерактивной
Любо-дорого стоять.
Мел лежит наш
без работы -
Стал бедняжечка
скучать!” - гучала ў гэты дзень у залі.

Нягледзячы на тое, што змяніліся і склад школьнай каманды КВЗ, і яе назва, майстэрства рассмяшыць нікуда не знікла. Сённяшнія ўдзельнікі каманды “Крылы” выглядаюць на сцэне дастойна, тым больш падтрымаў іх выступленне адзін з лідараў мінулага састава, выпускнік школы Кірыл Карпаў.





Паэтычныя радкі ў гонар першай настаўніцы прагучалі ў выкананні самых юных артыстаў канцэрта – першаклашак. Трэба падкрэсліць, што дэбют на вялікай школьнай сцэне атрымаўся паспяховым.



Добры настрой гледачам падарыла дэфіле «Гісторыя школьнай формы», падрыхтаванае вучнямі 9 “Б” класа, якія прадэманстравалі мадэлі школьнай вопраткі з часоў першабытнага чалавека да нашых дзён.



Вучань 6 класа Антон Буяльскі прачытаў верш «Калі б я быў настаўнік», дзе ў гумарыстычнай форме распавёў, якім бачыць сябе настаўнікам, дырэктарам школы, міністрам адукацыі.



**Свята атрымалася! Дзякуй усім удзельнікам і арганізатарам канцэрта! Поспехаў вам, настаўнікі!**

# Матулі, мы вас любім!



Звыклае правядзенне **свята да Дня маці** ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй праходзіла сёлета ў новай форме. Але гэты ніколькі не азмрочыла настрой і жаданне выказаць сваю любоў да самага роднага чалавека.

Павіншаваць сваіх матуль дзеткі змаглі праз відэазвароты. Акрамя таго, у холе ўстановы была створана фотазона ў форме святочнай паштоўкі. Кожны вучань мог сфатаграфавацца каля яе і пераслаць сваёй матулі. Спецыяльна да свята былі створаны міні-выставы з партрэтамі галоўнай захавальніцы сям'і – маці.

# За чысты лес!



У суботу 17 кастрычніка ў Бярэзінскім раёне прайшла чарговая акцыя **«Чысты лес»**, прымеркаваная да Года малой Радзімы. У чарговы раз у ім прынялі ўдзел навучэнцы і педагогі нашай установы. Штогод валанцёры ўносяць важкі ўклад у навядзенне парадку ў лясным фондзе. Усіх удзельнікаў аб'ядноўвае любоў да роднай зямлі і думка аб неабходнасці беражлівых адносін да прыродных багаццяў, усе яны выступаюць за экалагічна чысты лес.

Таму такая праца прыносіць задавальненне, працаваць у адным калектыве на свежым паветры было радасна і прыемна.

Па традыцыі пасля правядзення акцыі ўдзельнікам уручылі памятныя сувеніры.



**Уважліва сочыць за падзеямі ў школе Анастасія Бурая**

# “ЗАЦУГЛЯНЫ ДЫПЛОМ”: СТАРАННАЯ ПРАЦА ЮНЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ ПРЫНЕСЛА ДАСТОЙНУЮ ЎЗНАГАРОДУ

**Дыпломам II ступені XXIII конкурса работ даследчага характару (канферэнцыі) навучэнцаў устаноў адукацыі Мінскай вобласці была адзначана праца "Мастацкі свет зборніка апавяданняў «Зацугляны шчупак» Рыгора Ігнаценкі" (секцыя “Філалогія”). Аўтары даследавання Вераніка Палягошка і Паліна Русакова, вучаніцы 7 "Б" класа ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно”, навуковы кіраўнік А.Я. Ждановіч.**

Прызавое месца – плён стараннай, руплівай, удумлівай працы юных даследчыкаў. Яшчэ ў 6 класе дзяўчынкі наведвалі школьны клуб па краязнаўству “Вытокі”. Між іншым, праграма клуба, уласна распрацаваная А.Я.Ждановіч, была адзначана дыпломам пераможцы раённага метадычнага фестываля “Метадычная кухня: як прыгатаваць і з чым падаць”. Удзельнікі клуба Вераніка і Паліна розныя па характару, але яны праявілі аднадушную цікавасць да вывучэння гісторыі малой радзімы, уважліва слухалі, задавалі пытанні. Заняткі праводзіліся па-беларуску, але гэта не выклікала цяжкасцей, наадварот, натхняла гутарыць на роднай мове. Тады ж школьніцы пазнаёміліся з жыццём і творчасцю беларускага пісьменніка Рыгора Ігнаценкі, жыхара вёскі Паплавы, аўтара некалькі зборнікаў апавяданняў, якому ў лістападзе спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння. Паколькі на сённяшні дзень шырокаму колу чытачоў невядомыя грунтоўныя працы, прысвечаныя творчасці Рыгора Канстанцінавіча, юныя даследчыкі захацелі гэтую сітуацыю выправіць і зрабіць свой унёсак у вывучэнне і прапаганду твораў нашага “бярэзінскага Прышвіна”.

Зборнік апавяданняў “Зацугляны шчупак”, надрукаваны ў 2009 г., прыцягнуў увагу сваім арыгінальным загалоўкам.

Зацугляная рыба-волат – гэта дзіва, якое здарылася з аўтарам твора, таму што ён чакаў яго. Трапныя, слушныя думкі пісьменніка адгукнуліся ў сэрцах дзяўчат, якія таксама разумеюць, што прырода дае чалавеку магчымасць адчуць сябе свабодным, шчаслівым, галоўнае не быць бессэнсоўным яе знішчальнікам, разумна карыстацца яе багаццямі. Празрыстасць вобразаў, лёгкасць стылю, мілагучная моўная тканіна твораў зрабіла апавяданні займальнымі, цікавымі і запамінальнымі. Дакладная выпрацаваная сістэма працы дазволіла разабрацца з паняццем “мастацкі свет”, вызначыць яго кампаненты, а затым пасля ўсвядомленага разумення тэарэтычных зыходных выкарыстаць на практыцы атрыманыя веды.

У час выступлення, якое сёлета праходзіла онлайн, Вераніка і Паліна дастойна выступілі, дакладна адказвалі на пытанні журы, у склад якіх увайшлі выкладчыкі ВНУ, кандыдаты навук. Вядома ж, выступоўцы і настаўніца крыху хваляваліся, але падтрымлівалі адзін аднаго, бо сумесная праца яшчэ больш згуртавала іх, ды, як кажуць, родныя сцены дапамагалі, а яшчэ

Відавочна, што назапашаныя веды, уменне працаваць з навуковым і мастацкім тэкстамі, вопыт выступлення, уменне валодаць сабой, аўдыторыяй спатрэбяцца школьніцам у далейшым, дазволяць ім гучна заявіць пра сябе яшчэ не адзін раз. Самі ж дзяўчаты сціпла спадзяюцца, што хтосьці таксама прачытае апавяданні нашага земляка, пакіне хоць ненадоўга хатнія справы і адправіцца на ўлонне прыроды, каб там атрымаць непаўторныя ўражанні, асалоду ад свежага паветра, цішыні і прыгажосці навокал, а гэта, на думку пісьменніка і даследчыц, і ёсць сапраўднае шчасце.

**У наступным нумары чытайце матэрыял, прысвечаны пісьменніку-юбіляру**

# ТЭСТ: ХТО ВЫ З МАЛАДЫХ НАСТАЎНІКАЎ

**Раней ці пазней у школьнікаў узнікае жаданне быць падобным на кагосьці з настаўнікаў. Хочаце даведацца, на каго з нашых маладых настаўнікаў Вы будзеце падобныя? Тады адкажыце на пытанні тэста, падлічыце большую колькасць выбраных літар і даведайцеся.**

**1. У Вас з'явіўся свабодны час, чым Вы будзеце займацца?**

А. навяду парадак
Б. прачытаю кнігу
В. адпраўлюся на прагулку, слухаючы музыку
Г. буду спаць

**2. Вы засталіся дома сам-насам, выдатная магчымасць уключыць музыку грамчэй. Якога жанра музыку Вы будзеце слухаць?**

А. поп В. рок
Б. джаз Г. клубную музыку

**3. Вы вырашылі зрабіць рамонт ва ўласным пакоі, які будзе колер сцен?**

А. пяшчотна-ружовы В. светла-бежавы
Б. белы Г. пяшчотна-бэзавы

**4. У школьнай сталовай новаўвядзенне: кухары рыхтуюць спецыяльна для Вас любую страву, что Вы замовіце?**

А. торт В. сушы
Б. карбанара Г. салат з морапрадуктаў

**5. Вы даўно планавалі з сябрамі сумесны кінапрагляд, што будзеце глядзець?**

А. м/ф "Садко" В. ф/м "Гары Потэр"
Б. ф/м "Мы – Мілеры" Г. серыял "Сябры"

**6. Вы прыйшлі ў заапарк. Да вальера з якім зверам Вы пойдзеце адразу?**

А. аленяў Б. жырафа В. тыгра Г. малпы

**7. Горад ці краіна, у якой Вы марыце пабываць?**

А. Санкт-Пецярбург В. Нью-Ёрк
Б Нарвегія Г. Аўстралія



***ВЫНІКІ.*** **КАЛІ Ў ВАС...**

**Больш адказаў А:** Вы падобныя да настаўніцы замежнай мовы Вікторыі Уладзіміраўны Ламбоцкай. Вы мягкі, чулы, выхаваны чалавек. Уважлівы да суразмоўцы. Шкадуеце жывёлін. Валодаеце несумненным паэтычным дарам. Аднак, можаце раз'юшыцца, калі нехта вывядзе Вас з раўнавагі, бо не прымаеце людзей, якія ставяцца да Вас ці справы непаважліва. Аптыміст. Заўсёды гатовы дапамагчы.



**Больш адказаў Б:** У Вас шмат чаго агульнага з настаўнікам замежнай мовы Дзмітрыем Міхайлавічам Якаўлевым. Вы сур'ёзныя і адказныя, калі справа таго вымагае. Сапраўдны сябр. Нават пры першым знаёмстве ў людзей складваецца прыемнае ўражанне, што яны даўно Вас ведаюць. За знешняй строгасцю схавана душа рамантыка, які чула адносіцца да свету. Любіце смачна перакусіць на перапынках.



**Больш адказаў В:** Вам блізкая па духу педагог-арганізатар, у будучым лінгвіст-замежнік Марыя Андрэеўна Мікульчык. Вы бадзёры па духу чалавек, імкнецеся быць на хвалі пазітыву. У вас цёплыя і паважлівыя адносіны з людзьмі, бо вы ўмееце слухаць і падтрымаць суразмоўцу. Вы, несумненна, барацьбіт, умееце дастойна абараніць свой пункт гледжання. Працавітая, гатовая прыйсці на дапамогу. Дакладна ведаеце, чаго Вы хочаце.



**Больш адказаў Г:** У Вас шмат чаго агульнага з настаўніцай замежнай мовы Яўгеніяй Мікалаеўнай Аўсянскай. Вы актыўны чалавек, лёгкі на пад'ём, з энтузіязмам успрымаеце магчымасць змяніць звыклы лад жыцця і адправіцца ў падарожжа ў любую хвіліну. З пачуццём гумару. Адказны і патрабавальны да сябе і іншых людзей. Пры гэтым Вы ўмееце быць прывабным, элегантным. Будзеце прыкладаць усе намаганні, каб рэалізаваць задуманае.

**Калі ў Вас выпала роўная колькасць літар,** Вы даволі living рознабаковая асоба (магчыма, такая, як намеснік дырэктара Марына Леанідаўна Несцяровіч:) )

# На працоўнай ніве

З верасня педагагічны калектыў нашай установы папоўніўся двума маладымі спецыялістамі. Сваю працоўную дзейнасць пачалі педагог-арганізатар Марыя Андрэеўна Мікульчык і настаўнік замежнай мовы Дзмітрый Міхайлавіч Якаўлеў. Абодва маладыя, энергічныя, яны з лёгкасцю ўключыліся ў школьны працэс, закружыліся ў штодзённых школьных справах.
Давайце бліжэй пазнаёмімся з імі.

## ЯКАЎЛЕЎ ДЗМІТРЫЙ МІХАЙЛАВІЧ

**Дзень нараджэння 14 чэрвеня 1997 г.**
Скончыў СШ № 3, затым вучыўся ў лінгвагуманітурным каледжы (2013-2017).
Выпускнік Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

## МІКУЛЬЧЫК МАРЫЯ АНДРЭЕЎНА

**Дзень нараджэння 6 верасня 1998 г.**
Скончыла СШ № 2. Працягвае вучобу ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

### Ваш дэвіз:

**Дзмітрый**: Не канфліктуй!
З разумным дамаўляйся, дурня падмані.

**Марыя**: Per aspera ad astra
(“Праз церніі да зорак”).

### Як вас прынялі на першым працоўным месцы працы? Ці былі якія-небудзь цяжкасці?

**Дзмітрый**: Прынялі добра. Вялікая праблема – дакументацыя і правільнае афармленне. Аднак настаўнікі ўсяляк дапамагалі.
**Марыя**: Гэта мая родная школа, таму сустрэлі вельмі цёпла, па-сямейнаму, быццам і не выязджала нікуды.

### Ваша хобі
**Дзмітрый:** Фотаздымкі.
**Марыя:** Кулінарыя.

### Любімы колер
**Дзмітрый**: Зялёны.
**Марыя**: Чырвоны.

### Любімая кветка
**Дзмітрый**: Маргарыткі.
**Марыя**: Півоня.

### Любімы фільм
**Дзмітрый**: “Галодныя гульні”.
**Марыя**: “Гары Потэр”.

### Чым займаецеся ў вольны час?
**Дзмітрый**: Бегаю, гатоўлю ежу, рыхтуюся да заняткаў.
**Марыя**: Слухаю музыку, гляджу тэлефільмы альбо серыялы, размаўляю з сябрамі, гуляю.

### На ваш погляд, якімі павінны быць вучні?
**Дзмітрый:** Стараннымі, вясёлымі,уседлівымі.
**Марыя:** Шчырымі, творча актыўнымі, паважаць настаўніка і яго працу.

### Як Вы лічыце, якімі якасцямі павінен сёння валодаць настаўнік?
**Дзмітрый**: Быць адкрытым, з пачуццём гумара, разважным, тым, хто разумее.
**Марыя:** Ісці ў ногу з часам валодаць пачуццём гумара, але не даваць моцна расслабляцца, на уроках.

### Якія задачы Вы ставіце сабе ў педагагічнай дзейнасці?
**Дзмітрый**: Прафесійны рост.
**Марыя**: Прабудзіць у дзецях цягу да ведаў, каб у іх узнікла памкненне самім вывучаць прадмет, а не вывучаць усё суха па праграме.

### Самы яркі выпадак з Вашага школьнага жыцця
**Дзмітрый**: Восеньскі кірмаш, бо тады я ўпершыню зарабіў грошы.
**Марыя**: Гэта можа здзівіць, але я вельмі любіла ездзіць на сельгаспрацу. Гэта аб’ядноўвала наш клас і рабят з іншых класаў. Было шмат смешных сітуацый, пры гэтым мы займаліся карысным справай.

### Што такое шчасце?
**Дзмітрый:** Сям’я.
**Марыя:** Здароўе родных і блізкіх, разуменне таго, што ты камусьці патрэбны.

### Любімы школьны прадмет у школе
**Дзмітрый**: Англійская мова, геаграфія.
**Марыя**: Англійская мова, руская літаратура.

### Любімая кніга
**Дзмітрый**: Х.Муракамі.“Нарвежскі лес”
**Марыя**: О.Уайльд. “Партрэт Дарыяна Грэя”

### Што пажадаеце школьнікам і сваім калегам
**Дзмітрый:** Павагі і вытрымкі!
**Марыя:** Калегам вытрымкі і ўзаемаразумення з вучнямі, сіл і крэатыўнасці! Вучням шмат яркіх момантаў і вялікай удачы ва ўсіх пачынаннях!

***Дзякуй за бліц-апытанне!***

# Як пазбавіцца восеньскай хандры?



**Будзільнік паведамляе пра пачатак новага дня, аднак вы націскаеце "Адкласці" і зноў падаеце ў сон, і так адбываецца зноў і зноў. Адпраўляючыся на працу ці вучобу, ужо з раніцы Вы ловіце сябе на тым, што раздражнёныя. Яшчэ б, надзелі першае, што трапілася пад руку, па вуліцы беглі, збіваючы мінакоў, а пра ранішнюю каву і падумаць не было калі.**

Увечары, пасля заканчэння працоўнага дня, у вас ужо няма ніякіх сіл на сустрэчы з сябрамі і нават на тое, каб зайсці ў крамы. Хочацца хутчэй апынуцца дома, пад цёплым пледам і глядзець кіно. Вы стомлена засыпаеце, а раніцай амаль зноў напэўна з цяжкасцю расплюшчваеце вочы. Што ж можа дапамагчы справіцца з такім станам? Тут у кожнага свой рэцэпт. Запыталіся ў настаўнікаў, што трэба зрабіць, каб падняць сабе настрой?



**С.В.Абрамовіч** лічыць, што сумаваць не будзе часу, калі **заняцца навядзеннем парадку на агародзе.**



**І.М.Бародзіч** лічыць, што самы лепшы сродак выратавацца ад **восеньскага суму – гэта шакалад, а Н.С.Галуза – яблык.**





**Л.П.Чалей** раіць **слухаць громкую весёлую музыку,** каб падняць сабе настрой.





**І.П.Долбіна** прапаноўвае **дадаць у інтэр'ер яркакаляровыя прадметы: напрыклад, лісце, гарбуз.**

**М.А.Мікульчык** жадае ўсім, хто не знаходзіць сабе месца і сумуе, **не чакаць вясны і закахацца.**





**М.Л.Несцяровіч і А.Я.Ждановіч** аднадушныя ў тым, што **адагнаць сумны настрой дапаможа смачная вячэра і прагляд цікавага фільма**.

***Дзякуй усім, хто прыняў удзел у апытанні! Жадаем усім чытачам газеты заставацца бадзёрымі, з аптымізмам глядзець на свет!***

ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно" 223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба "Юны журналіст":
Бурая Анастасія, Верас Анастасія, Губчэўская Кацярына, Камароўская Ксенія і інш.
Рэд. А.Я.Ждановіч